**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# ПРЭС-РЭЛІЗ

**22 траўня 2024 года** **г. Варшава**

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай па стане на 15:00 (CET) 22 траўня 2024 года **ІНФАРМУЕ**:

Ад вечара 21 траўня Выбарчая камісія атрымлівае паведамленні ад беларусаў з пытаннямі наконт агітацыйнай рассылкі ў мэсэнджэры Telegram ад імя чат-бота ”План “Перамога”. Людзей непакоіць шэраг пытанняў:

- Ці сапраўды рассылку ініцыяваў і ажыццяўляе лідар спісу “Закон і правапарадак” Аляксандр Азараў і ягоная каманда?
- Калі гэта спланаваная акцыя каманды Азарава, то наколькі яны ўсведамляюць пагрозу бяспекі беларусаў у Беларусі, якія неспадзявана атрымалі такія паведамленні?
- Ці магчыма выкарыстоўваць чат-бот “План “Перамога” для уласнае агітацыі і самарэкламы?
- Ці з’яўляецца выкарыстанне чат-бота “План “Перамога” парушэннем выбарчай агітацыі, і як на гэта рэагуе Выбарчая камісія?

На дадзены момант Выбарчая камісія не валодае дакладнымі і праверанымі звесткамі пра асобаў, адказных за рассылку агітацыйных улётак праз чат-бот “План “Перамога”, і наступствы разасланых паведамленняў. Гэта, у сваю чаргу, не дазваляе рабіць абгрунтаваныя высновы пра выкананне або невыкананне патрабаванняў бяспекі з боку Аляксандра Азарава і чальцоў выбарчага суб’екта.

У сувязі з гэтым Выбарчай камісіяй накіраваны афіцыйныя запыты ў бок Аляксандра Азарава, Офіса Святланы Ціханоўскай і Аб’яднанага пераходнага кабінета для высвятлення абставінаў. Адрасатам пастаўлены шэраг пытанняў, у тым ліку датычныя таго, пад чыім кантролем знаходзіцца чат-бот “План “Перамога”, хто адказны за распаўсюд агітацыйных улётак і якія меры бяспекі прадугледжваліся пры ажыццяўленні рассылкі.

Акрамя таго, дадзенае пытанне будзе вывучацца Выбарчай камісіяй з прыцягненнем спецыялістаў у галіне інфармацыйнай бяспекі, пасля чаго будзе публічна агучана ацэнка правамернасці вышэй указаных дзеянняў.

Што тычыцца іншых пытанняў правядзення агітацыі, Выбарчая камісія лічыць **непрымальным распаўсюд агітацыйных улётак у бок падпісчыкаў чат-бота “План “Перамога” без іх дазволу на атрыманне адпаведнай**

**рассылкі**. Гэта, у прыватнасці, парушае Агульны Рэгламент аб ахове дадзеных Еўрапейскага Саюза (GDPR) і не адпавядае ўяўленням пра закон і правапарадак.

Выбарчая камісія звяртае ўвагу, што кожны кандыдат афіцыйна даў згоду трымацца Мемарандума аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі ў Каардынацыйную раду Беларусі, што прадугледжвае абавязак **выконваць усе неабходныя меры бяспекі і абароны інтарэсаў удзельнікаў кампаніі і грамадзян Беларусі.** Згодна з Палажэннем, аб правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года прыярытэтам выбарчай кампаніі з’яўляецца **бяспека ўдзельнікаў выбарчага працэсу на тэрыторыі Беларусі.**

Аб выніках разгляду сітуацыі і прынятых рашэннях Выбарчая камісія будзе своечасова інфармаваць грамадскасць.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька